Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Аднаскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

Пролетары всех стран, соединяйтесь!

№ 150 (385 Чацьвер. 6 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у чацьвер, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прыме ад 12 да 2 гадз. дня. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дня. Тел. № 90 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена, Менск, Комсам. 3.

Супроць крывавага тэрору ў Літве!

Да рабочых, сялян і да ўсіх працоўных БССР.

Дарагія таварышы!

Рабочыя і сяляне Літвы катуюцца і зьневажаюцца літоўскімі фашыстамі. У краіне разбушавалася крывавая стыхія. Фашыцкі пераварот, які адбыўся дзеля ўсьвядоміў трады цы Мусаліні, Цанкова, Хорці і ім падобных Літоўскі ўрад не пасьпеў шы захапіць уладу у свае рукі, як залацаў іх крывёю рабочых і сялян. 4 лепшыя прадстаўнікі рабочае класы зьявіліся афіцыя своры матаў. Для прыкрыцьця сваёй ганебнай фальшы аб нібы падрыхтаваным камуністамі паўстаньні, фашысцкі урад расстрэл т.т. К. Пажэла, Грэйфэнбэргэра, Чоркы і Гэдрыса паставіў задні чыслом. Гэтая подлясьць выні ніе з жаху перад чырвонай зданьню будучай сусьветнай рэволюцыі, якая ўсё яскравей выяўляецца.

Буржуазія і яе кліка добра разумеюць, што адным з небясьпечных варагаў зьяўляецца комуністычная партыя, супроць якой у першую чаргу яна і накіроўвае сваю крывавую расправу. Выданы ёю закон для ашуканства народу зьнішчаецца буржуазнай сворай, калі бы (закон) робіцца ёй непатрэбным.

Але загінуўшыя т.т. за справу рабочых і сялян не апошнія афіары: арміі белага тэрору працягваюцца Літоўскія фашысты забіваючы комуністаў, робяць сваімі рукамі ганебную справу на стольні сваёй буржуазеі, сколькі справай ангельскай і міжнароднай буржуазеі.

Кожны дзень прыносіць вёсткі аб новых і новых афірах белага тэрору. Літоўскія турмы перапаўняюцца лепшымі прадстаўнікамі рабочае класы і бяднейшага сялянства. За апошнія два дні ў Коўні арыштавана звыш 300 чал. пераважна нолі ністаў і перадавых рабочых і сялян.

Цэнтральны к-т МОПР'а Беларусі заклікае рабочых, сялян, працоўных Беларусі ўзьняць свой магутны голас протэсту супроць літоўскіх катаў і забойцаў рабочых Літвы, супроць зьдзекаў над рабочымі і сялянамі Літвы.

Патрабуйце безадкладнага вызваленьня арыштаваных, протэстуйце супроць белага тэрору ў Літве.

Цэнтральны к-т МОПР'а Беларусі заклікае ўсіх працоўных і ўсіх членаў МОПР'а павялічыць дапамогу політвязьняволеным і іх сем'ям.

Рабочыя! Сяляне! Служачыя! Чырвонаармейцы! Моладзь! Члены МОПР'а гучна заявіце: прэч катаў і забойцаў рабочых і бяднейшага сялянства Літвы, прэч прыгнятальнікаў рабочае класы і сялянства!

Прэч фашысцкі тэрор і літоўскіх катаў!

Нахай жыве рабочая краіна Літвы і ўсяго сьвету, якая ўпарта змагаецца пад кіраўніцтвам комінтэрну!

Нахай жыве чырвоны тыл сусьветнай рэволюцыі (МОПР)!

Нахай жыве будучая сусьветная рэволюцыя!

Цэнтральны Камітэт МОПР'а Беларусі.

Протэст Менскай рабочай моладзі супроць фашысцкага тэрору ў Літве.

Пятніца, апошні дзень сьнежня... Роўна ў тры, з усіх канцоў гораду—рушыліся на Плошчу Волі калёны комсамольцаў, дапрызыўнікаў, рабочай моладзі...

Гадзіньнік адбівае яшчэ адзін удар: палова 4-га. Усе ў зборы...

Мітынг протэсту Менскай рабочай моладзі адчыняе сакратар Менскага акруговага камітэту комсамолу т. Шаліна:

— Таварышы! Менскі акруговы камітэт комсамолу сёньня склікаў рабочую моладзь Менску, каб вынесьці гнеўны протэст супроць крывавых зьдзекаў фашыстых над пролетарыятам Літвы. Ня так даўно фашысцкія атрады спёрлі з улады стары дэмократычны ўрад Літвы. У адразу пачаліся зьверская расправа з рабочай клясай. Пашлі масавыя арышты. У гэты-ж час фашыстыя арыштавалі і 4-х віднейшых сяброў Літоўскай комуністычнай партыі. Адзін з гэтых таварышоў меў цесные дачыненьне і да нашай Менскай комсамольскай арганізацыі. Ён быў адным з яе організатараў. І вось у ноч на 27 сьнежня 1926 г. іх расстрэлялі..

— Таварышы мы вынесем наш гнеўны протэст супроць крывавага фашысцкага тэрору ў Літве!

Прамова т. Апанскага.

— Таварышы! 17 сьнежня 1926 г. ў Літве адбыўся фашысцкі пераварот.

Пасьля перавароту фашыстыя накіравалі свае атрады на рабочую клясу. Фашыстыя забілі 4-х віднейшых сяброў компартыі Літвы.

У першыя гады стары Літоўскі ўрад кіраўся дэмократычнымі лёзунгамі. Фашыстыя пачалі рабіць адкрытыя выпады супроць ураду. Але ўрад ня прымаў рашучых мер—і ў гэтым была яго памылка. Урэд быў пасьўны і не падаўлі фашыстых, а наадварот стаў ўрыцісваць рабочую клясу.

— Пасьля заключэньня дагавору паміж СССР і Літвой, траўля падвалася яшчэ больш. Гэты дагавор, бязумоўна, зьяўляўся ўдарам па палітыцы Англіі і Польшчы. І бязсумленна пераварот ставяўся ня без згоды і садзейніцтва гэтых дзяржаў.

— Вы, таварышы комсамольцы, павінны памятаць аб гэтым. Літва ўжо моцна падпадае пад уплыў Польшчы і Англіі...

— Мы протэстуем і кляймым ганьбай крывавейшаў катаў—фашыстаў!

Прамова т. Мірэцкага.

— Таварышы, ружовымі брызгамі падае кроў.

У мінулі год мы протэставалі супроць зьверскага забойства Вечаркевіча і Багінскага.

У палутарамільённай Літве ўжо тысячы заключаных. Мы павінны ім організаваць усямерную дапамогу. Мы павінны цяпер яшчэ больш узмацніць шэрагі МОПР'у!

Прамова т. Штэймана.

— Таварышы! Сярод загінуўшых у Літве 4 комуністаў маецца адзін з першых організатараў нашага Ленінскага комсамолу Беларусі. Гэта тав. Грэйфэнбэргэр. Ён быў сакратаром ЦК комсамолу Літвы і Беларусі.

Рабочая моладзь павінна выкаваць новых рэволюцыянэраў, новых барацьбітоў! Рабочая моладзь павінна атамсьціць за кроў таварыша Грэйфэнбэргэра і іншых!

* * *

Пасьля мітынгу аднагалосна прымаецца рэзолюцыя, прапанаваная тав. В. Маслоўскім.

Затым уся моладзь накіроўваецца па Ленінскай і Савецкай з гучнымі рэволюцыйнымі бадзёрымі песьнямі.

Ангельская апрацоўка.

АНГЛІЯ.—З гэтага падатлівага матар'ялу можа выйсьці добрая дубінка супроць СССР і комуніэму.!

Прэч крывавыя рукі!

(Рэзолюцыя мітынгу Менскай рабочай моладзі. Прынята аднагалосна).

Фашысцка-бандыцкі ўрад Літвы адзначыў першыя дні свайго прыходу да ўлады найзьлікішым злачынствам — расстрэлам 4-х комунараў: т.т. Пожэла, Гідрыса, Рафаіла Чорнага і Грэйфэнбэргера. Ашалеўшая фашысцкая кліка абліла зямлю крывёю найлепшых барацьбітоў рабочай клясы Літвы.

Бязьмежны наш гнеў і агідь да фашысцка-бандыцкага ўраду Літоўскай распубліки!

Праклён катам рабочае клясы!

Іх лёс ня будзе лепшы, як лёс Міколы Раманава.

Сусьветная і Літоўская рабочая класа аб гэтым пакляпашыма ў дні надыходзячых перамог, якія намінучы.

Сьмертны прыгавар гісторыі вісіць над буржуазіяй усяго сьвету!

Рабочая класа яго выканае

Мы шлём сёньня гарачае прывітаньне комуністычнай партыі і Комсамолу Літвы.

Прывітаньне Вам, гэроям цяжкага падпольля, адважным і сьмелым барацьбітом рабочае клясы. Мы ведаем і верым у вашу непераможную волю ў барацьбе, у вашу стойкасьць і мужасьць! Яны былі вашымі якасьцямі на працягу ўсёй вашай гісторыі барацьбы.

Гэтыя якасьці вядомы па гістарычных памятных днёх нашай сумеснай барацьбы і працы 1920 1921 г.г., калі мы разам поруч біліся супроць арміі польскіх паноў і памешчыкаў, за вольную Літоўска-Беларускую Савецкую Рэспубліку.

Т. Грэйфэнбэргэр быў адным з нашых віднейшых барацьбітоў у гэты памятныя дні, адным з організатараў і кіраўнікоў комсамолу Беларусі і Літвы. І імя яго, імя другіх расстрэляных комунараў будуць доўгія гады гарэць у сьвядомасьці сэрцах працоўнай моладзі Беларусі, як вобразы найлепшых барацьбітоў за справу рабочай клясы

Слава загінуўшым таварышам!

Мы ўпэўнены, што парадзеўшыя шэрагі Компартыі і Комсамолу Літвы будуць запоўнены сотнямі новых барацьбітоў.

Няхай жыве Компартыя і Комсамол Літвы!

Далоў фашысцка-бандыцкі ўрад Літвы!

— Далоў найміцаў Ангельскага капіталу!

— Прэч крывавыя рукі ад рабочых і сялян Літвы!

15 студзеня—дзень збору інтэрнацыянальнага пятачка.

15 студзеня пролетарская моладзь усяго сьвету будзе ўшаноўваць свайго правадыра, кіраўніка організатара—Карла Лібкнехта, загінуўшага ад рукі нямецкай вясьмішчыны, якая, падтрымоўваўся соцыял-здрадніцамі. З году ў год рабочая моладзь усяго сьвету ўшаноўвае свайго загінуўшага правадыра.

15 студзеня зьяўляецца жалобным днём у гісторыі рабочага руху за ўсіх сьвеце, калі з шэрагаў рабочае клясы быў зьдзеры вырваны адзін з яго галаваіцейшых вірайшоў, калі сусьветны комуністычны рух страціў свайго лепшага правадыра.

З таго часу ўжо прайшло восем гадоў. За гэты час сусьветны юнацкі рух рос і з кожным днём ўсё шырэй і шырэй працягваў свой ўрост, організоўваючы у сваіх шэрагах перадавыя атрады рабочай моладзі ўсяго сьвету.

Комінтэрн моладзі зьяўляецца дзецішчам Карла Лібкнехта, які на працягу адзінаццаці гадоў кіраваў юнацкім рухам, які ў годы імпэрыялістычнай вайны пад сваім кіраўніцтвам пасьлі баявыя атрады рабочай моладзі супроць крывавай імпэрыялістычнай вайны, супроць здрадніцтва другога інтэрнацыяналу.

Растуць шэрагі Комінтэрну Моладзі. Яго гледзячы на вялікія цяжкасьці, на гледзячы на праследаваньні, на гледзячы на турмы і расстрэлы, пролетарская моладзь усяго сьвету пад кіраўніцтвам КІМ'у, працягвае вясьці сваю гэрайчую барацьбу. Недаўна пашыраны пленум Комінтэрну Моладзі, які адбыўся ў Масаве, паказаў, якіе вялізныя посьпехі зрабілі нашы братэрскія Комуністычныя сэкцыі Моладзі ў капіталістычных краінах.

У Ангельшчыне, у Нямеччыне, у Кітаі ўсюды растуць і мацнеюць баявыя атрады сусьветнага юнацкага руху.

Адным з вялізных цяжкасьцямі выдатна работа нашых братэрскіх саюзаў моладзі.

Адсутнасьць сродкаў не дае магчымасьці нашым братом у капіталістычных краінах яшчэ в большымі патрэбамі якасьці сваю барацьбу і працу. Недахоп сродкаў часта не дае магчымасьці нашым саюзам рэгулярна выдаваць свае газэты, друкаваць дістоўні і г. д.

Вось чаму ўжо на працягу некалькіх гадоў УсеЛКСМ кожны год зьбірае сярод сваіх сяброў інтэрнацыяльны збор на карысьць зарубежных комсамольскіх організацый. Дитак,—гэта адно са вывеш шаў нашай інтэрнацыяльнай дапамогі і сувязі з замежнымі саюзамі моладзі Адзак, да гэтага часу мы ня з поўнаю акуратнасьцю і з належнай увагай адносіліся да гэтага важнага інтэрнацыяльнага абавязку.

Пачынаецца 1927 год. Надыходзіць 15 студзеня—дзень усяміваў нашага правадыра Карла Лібкнехта. Гэты дзень павінен зьявіцца ня толькі днём жалю па нашай вялікай страце, але гэты дзень павінен зьявіцца так сама і днём дапамогі барацьбе нашых зарубежных братэрскіх комуністычных саюз ў моладзі.

15 студзеня будзе праводзіцца збор інтэрнацыяльнага пятачку серод усіх комсамольцаў Савецкага Саюзу за 1927 год. Зусім зразумела, што перад імі стаіць задача точнага выкананьня гэта га нашага інтэрнацыяльнага абавязку.

Усе комсамольскія ячэйкі, усе комсамольцы павінны рыхтавацца да гэтага дню.

УНЯСІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ПЯТАК!

(У.Ім губкомам, абкомам, крайкомам, УсеЛКСМ і ЦК нацрэспублік)

ЦК УсеЛКСМ пачынае пачаць безадкладна кампанію за ўнос інтэрнацыяльнага пятака за 1927 год.

Збор пятака вызначаецца адначасова ўсюды ў дзень Леніна, Лібкнехта, 15 студзеня.

Правесьці у сувязі з гэтым падрыхтоўчую працу праз комсамольскі друк, газэты, сходы, плякаты, клюб, індывідуальнае пасьпрэдзаньне комсамольцаў аб необходнасьці прынесьці з сабою 15 га пятак і г. д.

Пажадана прыурочыць да дню 15-га студзеня ці наперададні вечар на інтэрнацыяльныя тэмы.

Вынучыць не пазьней 5 га студзеня 1927 году па ячэйках для збору пазадзенных збіральнікаў, якія павінны таксама правесьці ўсю папярэднюю арганізацыйна-тэхнічную працу.

Грошы, якіе будуць сабраны ячэйкамі ў працягу 3 дзён, пераводзяцца ў раённыя камітэты, якія ў сваю чаргу пересылаюць іх у губком.

Губкомы пераводзяць грошы ў ЦК не пазьней 15 га лютага 1927 году.

Сакратар ЦК Усе ЛКСМ МАТВЕЕВ

Пам. Заг. Організ-рку ЦК УсеЛКСМ ЕМЕЛЬЯНАЎ

Чатыры.

У маленькай Літве забілі вялікіх людзей: вялікіх рэволюцыянэраў.

Карла Пажэла, Юзэфа Грэйфэнбэрга, Рафаіла Чорнага і Казіса Гэдрыса зваалі на срэбны сьнег чатыры фашыцкія кулі. Людзі з „жавальгібы"*) паднялі іх целы на грузавік, накрылі брэзэнтам, і адвезьлі на вакзал—схаваць. У першы раз чатыры слаўных сыны рабоча-сялянскай Літвы не маглі выказаць свайго протэсту, упяршыню яны маўчалі і не правілілі катам.

Але вось ад забрызганых крывёю сьцен Ковенскай турмы ўзьлымаецца вестка. Яна ляціць у хвалях радыё, поўная стрыманай болі і гневу—маленькая, пацрадковая вестка:

„растрэлены т.т. Пажэлла, Грэйфэнбэргэр, Чорны, і Гедрыс". І ўсё.

А на заўтра газэты ўсяго Саюзу апавядаюць гэту вестку мільёнам ва чэй.

Вестка абдлятае фабрыкі, шахты, парты, клубы, казармы і вуліцы; прабіраецца ў грудзі кожнага пролетарыя, кожнага комуністага і комсамольца кліча на мітынгі протэсту і дэмонстрацыі; дыктуе рэзолюцыі супроць крывавага фашысцкага тэрору ў Літве; будзіць памяць аб загінуўшых таварышах, неўстрашымых, слаўных рэволюцыянэраў, паўшых ў нягоўнай барацьбе.

*) Літоўска ахрэнка.

... Канун новага году. Весёла скрыпіць пад падэшвамі моцны, іскрысты сьнег. Бойка гандлююць кооператывы і магазыны Савецкай і Ленінскай. Мастаўна поўны снуючай румянай публікі.

3 гадзіны. Цямнее. З усіх бакоў Менску—з Ляхаўкі і Камароўкі з Акцябрскі і Пярэсны, рухаюцца атрады моладзі, з разгорнутымі сьцягамі з сьвежанамалёванымі на кавалках бібулы і фанэры—лёзунгамі. На галоўках штандараў дрыжаць чорныя істужкі.

Абывацельшчына ўстрывожана:

— ... „Што гэта? Хто гэта зноў памёр? Можа крамы будуць зачыняць?.."

Атрады сьцягваюцца на Плошчы Волі.

На старой вежы гадзіньнік хмура шавеліць стрэлкамі. Хутка палова чацьвёртай.

Ужо прышла Ляхаўка і амаль увесь гарадзкі раён. Пара пачынаць.

Група акругкомаўцаў, прадстаўнікоў партыі і МОПР'у залымакцца па сходам Акрвыканкому і доўга шукаюць дзьвярэй на бальком, які выходзіць на плошчу. У калідоры мяне хапае за рукаў Калманка Штэйман і паказваючы на дзьверы фінчасткі, кажа адрывіста і ўзхвалёвана:

— Вось тут у гэтым пакойчыку, у 19-ым пракаваў Юзэф Грэйфэнбэргэр. Тут зьмяшчаўся комсамольскі штаб.. Ён быў першым сакратаром першага ЦК комсамолу Літвы і Беларусі... Я памятаю—ён тут па вечарам, пасьля ліхарадачнай, бяссупыннай працы вывучаў яўрэйскую мову... Жадаў цясьней зьвязацца з масамі яўрэйскай рабочай моладзі... Слаўны, незабываемы таварыш! Цяпер такіх мала.

Калманка абрывае прамову. Выходзім на цярэс. Засьнежаны бальком унізе—тысячы твараў. Качаюцца сьцягі. Далёкія гудкі заводаў.

Мітынг. Гарачая песьня халодных труб оркестру. Тысячы рук зьнімаюць з галоў шапкі. Сьняжынкі падаюць на галовы.

Васька Маслоўскі чытае рэзолюцыю протэсту. У яго моцны, ледзь хрыплы голас. Усё хутчэй ідзе сьнег. Хлоп'я стукаюць па маленькаму шматку паперы. Вецер рве яго з пачырванеўшых на марозе Васькіных пальцаў. Але ён моцна трымае рэзолюцыю. Бач—у гэтых нямногіх радкох, у клалася ўся вялікая брацкая любоў Менскай рабочай моладзі да загінутых таварышаў, увесь гнеў на Ковенскіх катаў...

Скончыў. Гулкае і моцнае ўра успыхвае над плошчай.

Атрады разыходзяцца. Як многа, аднак, новых комсамольцаў! Як многа навічкоў у нашай організацыі Яны павінны выкаваць з сябе новых Пажэла, новых Грэйфэнбэргэраў...

Усё мацней спадаюць разарваныя ветрам сьнягі.

Міх. Гольдбэрг.

Праца упаўнаважаных па друку.

„ЧЫРВОНУЮ ЗЬМЕНУ“ павінна чытаць уся моладзь.

Прасунем газэты ў масы.

Нарада ўпаўнаважаных у Талочыне.

(М-ка Талочын, Аршаншчына).

Нядаўна ў нашым мястэчку адбылася першая нарада ўпаўнаважаных па друку. Першым пытаньнем нарады быў інструктыўны даклад аб задачах і абавязках упаўнаважанага па комсамольскім друку. У сорэчках упаўнаважаныя самі прызнаваліся, што да нарады яны ня ведалі сваіх задач і абавязкаў. Яны выконвалі тэхнічную працу па збору падпіскі на газэты. Ні водзін не зьяўляўся членам ці кандыдатам бюро ячэйкі і наогул кіраўніцтва ў гэтай галіне комсамольскай працы ня было.

Нарада высунула шмат практычных мерапрыемстваў у справе ажыўленьня працы ўпаўнаважаных. Не толькі тэхнічнай працай, як прыём падпіскі на газэты, павінны яны займацца, але і популярызацыяй розных выданьняў. Дзеля гэтага нарада выказалася за неабходнасьць арганізацыі ў мястэчку гурткоў „прыхільнікаў газэты“, у прыватнасьці „Чырвонай Зьмены“, пабудовы вечароў друку, конкурсаў на лепшага ўпаўнаважанага і падпішчыка.

Таксама нарада вызвіла слабую расвяўсюджанасьць юнацкіх выданьняў сярод беспартыйнай моладзі. Упаўнаважаныя часам забываюць аб гэтай працы. Каб зьнішчыць усе недахопы, нарада пастанавіла ставіць пытаньні аб расвяўсюджваньні юнацкіх выданьняў на сходах і профдзёх моладзі.

Адзначаючы слабую сувязь упаўнаважаных па друку з юнкорамі, нарада сказала:

— Кожны ўпаўнаважаны па друку павінен быць юнкорам і ўцягваць у юнкораўскую працу ўсіх комсамольцаў сваёй ячэйкі.

Але выкананьне ўсіх гэтых абавязкаў магчыма будзе толькі ў тым выпадку, калі ўпаўнаважаны па друку будзе працаздольным і разьвітым. Дзеля гэтага яму трэба шмат працаваць над сабою: рэгулярна чытаць газэты, кніжкі, ведаць усе пастановы партыі і комсамолу па пытаньням друку.

Бюро ячэек і райком павінны дапамагаць у працы ўпаўнаважанага.

Трэба штомесячна ставіць на пасяджэньні бюро ячэек справаздачы ўпаўнаважаных, а таксама заслухоўваць яго даклад на сходзе ячэйкі.

МІХ. ЗАК.

Моладзілі падпіску

М-ка Лельчычы, Мазыршчына

Сярод моладзі мястэчка Лельчыцы раней заўважалася паніжэньне выпіскі на газэты. У ліпені месяцы выпісвалася 20 экзэмпляраў „Чырвонай Зьмены“, а чым далей дык усё мены і менш. „Юнгэр Арбэйтэр“ выпісвалі 6 экзэмпляраў „Беларускі Піонэр“ зусім на выпісваўся. Гэта тлумачылася тым, што бюро ячэйкі забывалася пра гэтую галіну працы.

Цяпер ячэйка ЛКСМБ і атрад юных піонэраў шчыра ўзяліся за распаўсюджаньне газэт і часопісаў сярод моладзі. Яны вядуць агітацыю, тлумачаць неабходнасьць выпісваньня. І мы бачым, што падпіска паднялася на сто про. На цяперашні месяц „Чырвонай Зьмены“ выпісвалі больш чым 25 экзэмпляраў, а на сьнежань і студзень яшчэ прыбавіліся. „Юнгэр Арбайтэр“ выпісваюць 15 экзэмпляраў. „Беларускі Піонэр“—10.

У ёй гэта адбылося з тэй прычыны, што акрамя прапаганды сярод беспартыйнай масы кожны комсамолец лічыць абавязкам выпісваць тую ці іншую газэту.

Юнкор Е. Лельчук.

Раней хоць дзьве, а цяпер...

Варонецкі с.-с., Ветрынскі раён, Полаччына.

На тэрыторыі гэтага сельсавету ёсьць тры ячэйкі ЛКСМБ, якія па распаўсюджаньню газэт нічога не робяць. Раней выпісвалі ў Варонецкую хату-чытальню хоць усяго 2 экземпляры „Чырвонай Зьмены“ а цяпер і гэтага няма. Неахвота ў далейшым узяцца за выпісваньне газэт і часопісаў, бо кожны комсамолец павінен ведаць, што робіцца ў нас і за межамі.

Асабліва трэба зьвярнуць увагу на выпіску „Чырвонай Зьмены“, бо яна ў працы комсамольскай ячэйцы неабходна.

Бязлольны.

Пісьманосец губляе газэты.

(Вёска Яшчыцы, Стрэшынскі раён, Бабруйшчына)

У нашым сельсавеце пісьманосцам зьяўляецца Андрушэнка Ісак.

Як толькі пачынае пошта прывазе лісты і газэты ён іх забірае і некалькі дзён трымае ў сябе дома.

Ходзяць сяляне вёскі і ня ведаюць дае іх газэты дзяюцца, а пра пісьманосца ні слуху, ні духу.

Некалькі дзён падрад ёй мне ня прымосіў газэту. Зайшоў я да яго і пытаю, дзе газэты? Ён адказвае:—А чорт іх ведае. З гэтай прычыны некаторыя сяляне адмаўляюцца быць падпішчыкамі, кажучы:

— Якая з гэтага карысьць, усё роўна газэту ў вочы ня бачыш.

Трэба Стрэшынскаму паштоваму аддзяленьню зьвярнуць на гэтае зьявішча належную ўвагу.

КОМСАМОЛЕЦ.

Кожны вучань—подпішчык на „Ч. З.“

(Койданаўскі раён, Вільшчынская ШСМ, Меншчына)

У мінулым годзе „Чырвоную Зьмену“ выпісваў амаль што кожны вучань, але інакш абставіць справа ў сучасны момант.

Бюро ячэйкі ЛКСМБ на гэтя зьвярнула ўвагу, дала „нагане“ упаўнаважанаму, і ўхвалілі, каб кожны вучань, які атрымлівае стыпэндыю па першай катэгорыі, выпісаў „Чырвоную Зьмену“.

Міхась Маркевіч

Прывучаем моладзь чытаць газэты.

(Вёска Лішыванава, Лідзянскі раён, Аршаншчына).

З арганізаваўся ў нашай вёсцы гурток прыхільнікаў газэты яшчэ ўлетку 1926 году.

Актыўны ўдзел у працы гэтага гуртка прынята наша моладзь. Больш паловы хлапцоў і дзяўчат вёскі запісаліся ў сябры гуртка, выпісваюць і чытаюць газэты, вярбуюць новых падпішчыкаў.

Праца гэтага гуртка вычвілася яшчэ ў тым, што ў вёсцы лік падпішчыкаў на газэты павялічыўся да 22 чалавек.

Уся моладзь вельмі зацікавілася працай гэтага гуртка. В. ІМПЭТ.

ФІЗ-КУЛЬТ-УРАЗ

Трэба больш гурткоў!

(Клюб друкароў, Менск)

Фізкультурным саюзным гурткам, пры клюбе друкароў, ахоплена 4 групы, гэтага-ж адзак мала. Жаданьне займацца ў гуртку, асабліва за гэты час, узрасло, ня толькі з боку моладзі але і з боку дарослых рабочых. Усіх жадаючых гурток абхапіць ня зможа, бо ён ня мае на гэтую справу пэўных сродкаў.

Дапамагае ў гэтай справе гурткі толькі прайдзеньне клюбу і то не дастаткова.

Для поўнага абслугоўваньня ўсіх жадаючых займацца спортам неабходна:

Каб гэтым пытаньнем зацікавіўся культадзел Цэнтральнага праўленьня саюзу і для спорту выдзеліў бы асобны фонд, альбо, кожны фабзаўком, асобна, зрабіў адзік з сваіх сродкаў у агульны фонд фізкультуры.

Уся справа цяпер, па стварэньню новых груп, кульгае з-за адсутнасьці сродкаў.

Памяшканьне ёсьць, і прылады для заняткаў таксама ёсьць.

Калі грашовая справа наладзіцца, гурток створыць яшчэ некалькі груп і мы зможам ахапіць дзесяткі сяброў нашага саюзу.

Каму гэта належыць, трэба падумаць гэтую справу наладзіць.

Мікола.

Не займаюцца фізкультурай.

Мястэчка Талочын, Аршаншчына.

У той час, калі ў нас ёсьць добры інструктар, фізкультура сярод комсамольцаў нашага мястэчка зусім не праводзіцца.

Улетку яшчэ займаліся, а як надышоў зімны пэрыод, дык пра яе і забыліся. Мне здаецца, што ўсіх падных ячэйкоўных сходах аб неабходнасьці праведзеньня фізкультуры сярод комсамольцаў, але чамусьці ў жыцьцё гэта не праводзіцца.

Віною гэтаму самі комсамольцы, бо інструктар ніколі іх ня можа сабраць на заняткі.

Таксама сьпіць і райбюро фізкультуры.

Фізкультурнік.

Заняткі ідуць добра.

(М. Круглае, Аршаншчына)

Быў у нас у мястэчку інструктар па фізкультуры т. Ваўчок, уся моладзь гарэла жаданьнем займацца ў гурткох, але ён ня мог паставіць справу як належыць.

Сабраўшся, бывала на заняткі, пачнуць ламіць сабе галовы скачучы цераз драўляную кабылу і на гэтым заняткі спыняюцца.

Фізкультурнікам усё гэта вельмі абрыдла.

Але вось прыехаў да нас новы інструктар т. Ясінскі, дэмобілізаваны камандзір. Праца закіпела.

Паставілі платны спэктакль збор з якога пашоў на патрэбы гуртка фізкультуры.

Зрабілі перадзьвіжны турнік, змату; усіх сяброў гуртка разьбілі па сакцыям і заняткі пачалі праходзіць добра.

Цяпер у гуртку дысцыпліна паставлена на належную вышыню.

Спортсмэн.

Неабходна падняць дысцыпліну.

(Школа вучнэўства, пры МБ чыгунні, Менск).

З таго часу як заняткі па фізкультуры былі перанесены ў новае памяшканьне ў нас праца наша нармальна.

У сучасны момант наш кіраўніцтва паставіў перад сабою задачу падняць дысцыпліну на занятках, а разам з гэтым даць уразуменьне нармальна фізычным разьвіцьці маладога рабочага організму.

Ажыцьцяўленьне гэтай задачы пойдзе ўпоўнай і на падняцьце дысцыпліны ў школе наогул.

Р. К.

Замежнае жыцьцё.

(Агляд за бліжэйшы час).

Панская Польшча і Літва

СССР, з кожным днём узмацняючы сваё эканомічнае і палітычнае становішча на сусьветнай арэне, стаіць бяльмом у вачу буржуазным палітыкам.

Ваенны пераварот Польшчы на чале з ваенным дыктатарам Пілсудзкім—гэта адзін з крокаў да стварэньня контрэволюцыйнага кола супроць СССР.

Галоўныя мэты Пілсудчыны-захват Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі.

Ад гэтых плянаў Пілсудзкі пасьля майскага перавароту не адмовіўся. Наадварот „Голас Праўды“ і орган ваеннага міністэрства „Польска Збройна“ выступілі адначасова з артыкуламі, якімі даводзяць, што сучасныя ўсходнія межы Польшчы ня могуць ве здавольніць і да гэтага часу застаюцца часовымі. Лёзунг польскай палітыкі, на думцы газэт павінны быць—„За Буг“, „за Нёман“.

Ці зможа Польшча выканаць свае пляны? Здавалася-б, што Пілсудзкі напрабуе дагаварыцца з Заходнімі сваімі суседзямі.

Сапраўды-ж мы бачым другое. Адносіны Польшчы з сваёй блізкай суседкай Нямеччынай ня толькі пагоршыліся, а нават зьвічна пагоршыліся. Прычынаю гэтага—узмацненьне эканомічнага і палітычнага становішча Нямеччыны. Заключаным Лёкарнскім дагаворам, Нямеччына прызнала непарушнасьць меж паміж сабою і Францыяй. Дець такое абяцаньне адносна свае мяжы з Польшчаю, яна адмовілася. Усе спробы Францыі дабіцца ад Нямеччыны гарантыі польскай мяжы, скончыліся няўдачаю. Вядома, што такое становішча на можа спрыяць польскім жаданням і лёзунг Пілсудчыны—„за Буг“, „за Нёман“ застанецца дёзунгам, які Польшчы ня ўдасца правесьці ў жыцьцё.

Літоўскія падзеі, якія адбыліся на гэтых днёх, можна лічыць крокамі ангельскай палітыкі, якая выкананы рукамі Пілсудчыны.

Пілсудзкі аб перавароце ў Літве кажа так:

— Адзіная мера, прынятая мною ў дні перавароту ў Літве заключаецца ў тым, што я уважліва сачыў за падзеямі ў Коўне і на нашай мяжы з Літвою. Я ня думаю, што нервы нашай пагранічнай адміністрацыі і гарнізона падягалі сур'ёзным іспытам, бо адносіны Літвы да Польшчы носяць выключны характар. Літва не прызнае становішча міру з Польшчай.

Далей Пілсудзкі кажа:

Польскі ўрад ужо за месяц да літоўскіх падзей меў дасканальную інформацыю, што Літва ўступае ў перыяд, калі насьпеўшыя праблемы будуць разьвязаны сілаю. Я аднак ня бачыў цяпер ніякіх довадаў, каб баяцца, што ў нас будуць сапраўды сьвяты з-за нашага неспакойнага суседа, які так лёгка выкідвае словы „вайна“ з такой цяжкасьцю слова „мір“ (Тас).

Вядома, што сьвята ў Літве ўжо і цяпер канчаюцца. Літоўскія фашысты не супыняюцца бадзяць пяны, што комуністычная партыя Літвы падрыхтоўвала паўстаньне, каб захапіць уладу ў свае рукі.

Фашысты растрэльваюць найлепшых барацьбітоў-працоўных сяброў комуністычнай партыі. Сусьветны пролетарыят пратэстуе супроць крывавай расправы. Усе выдумкі быццам-бы комуністычная партыя Літвы падрыхтоўвала ўзброенае паўстаньне, кажуць за тое, што фашысты, зарганізаваныя палітыкаю Ангельшчыны, хочуць парушыць добра-суседзкія адносны Літвы і СССР. Але працоўным Літвы вядома уся гэтая цэрамонія. Непарушанасьць добра-суседзкіх адносін СССР і Літвы знойдуць падтрыманьне ў працоўных массах Літвы.

Ангельшчыне ашукаць рэволюцыйны Кантон не ўдалося.

Перамовы ангельскага пасланіка ў Кітаі Маільс Лямэнсана з кантонскім міністрам замежных сораў Яўгэнам Чэнам ні к чаму не прывялі.

Ангельшчына гатова была прызнаць Кантон, як частку Кітайскай дзяржавы, але разам з тым ніяк не магла адмовіцца ад падтрыманьня зносін з Пекінскім урадам і іншымі кітайскімі провінцыямі. Справа ішла аб пераўтварэньні адзінай дзяржавы Кітаю ў шэраг асобных рэспублік, з якімі можна-б было вясьці перамовы асобна і натраўляць адну на другую.

Кантонскі рэволюцыйны ўрад, які зьяўляецца фактычна ўрадам большай часткі Кітаю, пры гэтым з найбольш разьвітай ў эканомічных і палітычных адносінах, патрабаваў, каб яго прызналі нацыянальным урадам усяго Кітаю. Такую заяву зрабіў прадстаўнік Кантонскага ўраду ў Жэневе, які патрабаваў, каб кітайскі дэлегат у Літве Нашы дзейнічаў, як прадстаўнік Кантонскага нацыянальнага ўраду. Безумоўна, з такімі прапановамі Ангельшчына згадзіцца ня можа. Кантон каму рэволюцыйнаму ўраду прыдзецца на далей сілою абуджа'замацоўваць свае правы на прадстаўніцтва ўсяго Кітаю.

Гэтую частку свае праграмы Кантонскі ўрад ужо ажыцьцяўляе пасьпешна. Кантонскае рэволюцыйнае войска ідзе пасьпешна наперад і падтрымоўваецца кітайскімі рабочымі і сялянствам. Галоўныя сілы народнай армії прасоўваюцца ўздоўж Луньхайскай чыгункі, а перадавая атрады ўжо дасягнулі Шысу (у 32 кілёмэтрах ад Лянуі). Па вестках, якія маюцца, непасрэдная мэтай народнай армії зьяўляецца захват Куньсіена, дзе знаходзіцца ваенны арсенал. Японскае агэнства Тохо паведамляе, што Чжан-Цзо Лін 28-га ўвечары разасла'ў цыркулярнае паведамленьне аб перадачы дысцыплінарному суду начальніка гадоўнага штабу мукдэнскага войска гэнэрала Ян Ю Ціна і яго памочніка Чэн Чы Ена. Непаразуменьні ў Чжан-Цзо-Лінаўскіх войсках будуць і надалей. Ангельшчына, як-бы яна не хацела, прыдзецца прызнаць адзіную дзяржаву Кітаю пад кіраўніцтвам рэволюцыйнага Кантонскага ўраду.

Паход ангельскай буржуазіі супроць трэд'юніонаў.

Здавалася, што агарадзіўшы свае пануючае становішча ў Эўропе і паспрабаваўшы агарадзіць сябе ў Кітаі ад шкодных здарэньняў, хоць-бы перамовамі з Кантонскім урадам, ангельскі кансэрватыўны ўрад паспрабуе наладзіць справы ў сярэдзіне свае дзяржавы, як-та пачне адбудову прамысловасьці, якая паслабела ад доўгатэрміновае агульнай забастоўкі гарнякоў. Але наадварот.

У той час, калі шахтаўласьнікі выкідаюць на вуліцу тысячы найбольш ахтыўных дзеячоў агульнай забастоўкі, Ангельскі ўрад у самым хуткім часе выпрацоўвае новы закон аб правах рабочых і профэсыйных саюзаў.

Па вестках, якія маюцца, гэ[illegible] законы даюць правы, якія ангель[illegible] рабочыя мелі год таму назад, на[illegible]чаецца ў профдзеяўзаў адабраць [illegible] ва абгаўляць агульную забаст[illegible]каві ня будзе аб гэтым паведам[illegible]ны ўрад за доўгі час да пр[illegible]шэньня.

Забастоўка, па вестках, б[illegible] прыроўніваецца да адкрытага [illegible]станьня, як дзяржаўная зарада. А[illegible]ліва цікавіць, ангельскіх рэакцы[illegible]раў пытаньне аб свабоўскім а[illegible] на палітычныя справы.

Што мы павінны ведаць

Працоўным СССР і працо[illegible] усіх краін павінны быць зусім [illegible] мы авантурыскія пляны ангел[illegible] дыпляматы. Працоўныя масы па[illegible]пільна сачыць за ўсімі падзеямі [illegible] Ангельшчына, рукою сваіх ва[illegible]цыхуе напад на краіну са[illegible] усе павінны бачыць дзе і кім [illegible]ряецца пагроза міру ў Эўропе. [illegible] хоча міру; Ангельшчына яго з[illegible] СССР заключае з пагранічнымі [illegible]жавамі мірныя дагаворы аб [illegible]паўзе; Ангельшчына гэтаму с[illegible]чыць, і рыхтуе з прымежнымі [illegible] дзяржавамі ўзброены бар'ер с[illegible] нас, рыхтуе фашыцкія калёны [illegible]роць крві ны сацыялістычнай р[illegible]цы. СССР адстойвае незалеж[illegible] малых нацыянальнасьцяй, ад[illegible] іх права на самавызначэн[illegible]гельшчына дапамагае малым [illegible]нальнасьці душыць, зьніш[illegible] СССР мэта, мірнае дзелавое [illegible]поўніцтва з прымежнымі дзяр[illegible] Мы-ж бачым, што Ангельшчын[illegible]туе сур'ёзныя супярэчнасьці [illegible] нацыянальнымі народамі. [illegible]розьніцу палітыкі абодных [illegible] павінны бачыць.

М. Х—[illegible]

Будзем на варце!

Асноўныя пытаньні ўдзелу комсамолу ў перавыбарах сельсаветаў.

Цэнтральны Камітэт УсеЛКСМ у сваім лісьце да ўсіх абкомаў, губкомаў УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМ нацыянальных рэспублік аб наыходзячай кампаніі перавыбараў саветаў, адзначыўшы вялізарную політычную важнасьць ранейшых перавыбараў і асабліва перавыбараў 1927 году—высунуў прад організацыямі шэраг наступных баявых і адказных задач.

Комсамол павінен дапамагчы партыі ўзмацніць саюз батрацкоў і беднякоў з серадняками

У гэтым годзе ў перавыбарную кампанію партыя ставіць задачы дальшага ўзмацненьня і паглыбленьня савецкай (пролетарскай) дэмократыі на падставе ажыўленьня саветаў, прыбліжэньні савецкага апарату да працоўных сялянскіх мас, барацьбы з бюрократызмам для забясьпячэньня перамогі соцыялістычнага будаўніцтва в СССР. Сёлетнія перавыбары павінны паслужыць далейшаму ўзмацненьню саюзу рабочых і сялян і ўзвышэньню кіраўнічай ролі ў сельскіх і местачковых саветах пролетарскай часткі вёскі і комуністычнай партыі, рашуча дамагаючыся політычнага адмежаваньня кулацтва і нерацоўных элемэнтаў.

Перавыбары сельсаветаў павінны яшчэ больш узмацніць саюз беднаты і батрацтва з серадняками супроць кулака, у чым важнейшую ролю павінен будзе адыграць шырокі беспартыйны батрацка-бядняцкі і серадняцкі актыў.

Недахопы леташняй кампаніі павінны быць выпраўлены

Перавыбары мінулага году далі некаторае паваяпшэньне мэтадаў грамадзкай працы саюзных організацый падкрэсьлілі значна ўзросшую ролю комсамолу, як памочніка партыі, паказалі досыць вялікую ролю і месца Комсамолу ў практычнай і конкрэтнай працы сельскіх і местачковых саветаў.

Хоць мы і мелі ў мінулых перавыбарах некаторыя дасягненьні, а навяць леташнюю кампанію перавыбараў у поўнай меры здавальняючай—зусім нельга.

Вялікімі недахопамі перавыбараў сельсаветаў у 1926 годзе ў маштабе усяго СССР былі: часта за вясковымі комсамольскімі ячэйкамі назіраўся так званы „хвасьцізм", гэта значыць калі ячэйка ня выступала ад свайго імя ў абарону політыкі партыі а падпадкавала хворым настроям, не ставала за свае кандыдатуры і г. д., былі выпадкі, калі комсамольскія ячэйкі забываліся пра кіраўнічую ролю партыйнай ячэйкі і сабе высоўвалі на першае месца; малое прыцягненьне беспартыйнай моладзі да ўдзелу ў перавыбарнай кампаніі і інш.

Актыўна дапамагаючы партыі ў правядзеньні пастаўленых ёю задач у сучаснай перавыбарнай кампаніі, комсамольскія ячэйкі павінны дабіцца рашучага выжыцьця недахопаў, што далі сабе адчуць у мінулыя гады.

Таксама неабходна дабіцца забясьпячэньня поўнага партыкіраўніцтва ў адносінах удзелу ў перавыбарах ячэек тых вёсак, дзе няма партыйных ячэек, шляхам поўнай пагоджанасьці ўсіх іх мерапрыемстваў з упаўнаважанымі выбарчых камісій.

Усю батрацкую і бядняцкую моладзь уцягнуць у перавыбарную кампанію.

Асобліва паважнай і адказнай павагі набывае дапамога комсамольскіх ячэек партыі ў справе організацыі ў перавыбарную кампанію беднаты і батрацтва і ўзмацненьня іх саюзу з серадняками для сумесных выступленьняў на перавыбарных сходах, для абарону сваіх інтарэсаў.

Неабходна самая шырокая дапамога партыйным ячэйкам у скліканьні перавыбарчых сходаў беднаты, прыцягваючы на іх усю батрацка-бядняцкую моладзь, гэтым самым падрыхтаваўшы яе да саміх перавыбараў.

Актыўных дзяўчат—у сельсаветы.

Яшчэ зусім малы процант у сельсаветах жанчын наогул і дзяўчат у прыватнасьці.

Праводзячы прадвыбарныя падрыхтоўчыя сходы трэба ствараць думку сьвядомага выбіраньня ў саветы жанчын.

Кандыдатуры з моладзі павінны быць працаздольнымі, вытрыманымі і надзейнымі.

Асабліва адказнасьць павінна быць праяўлена комсамольскімі організацыямі ў перавыбарнай кампаніі пры падборы кандыдатур з моладзі. Трэба высоўваць з бядняцкай, батрацкай і лепшай часткі серадняцкай моладзі надзейных таварышоў, якія сапраўды карыстаюцца аўтарытэтам у масах вёскі, якія працуючы ў сельсаветах прынясуць вядзізную карысьць социялістычнаму будаўніцтву ў нашым краі.

* * *

Перавыбарную кампанію, набыты ў ёй вопыт комсамольскімі ячэйкамі трэба ўсебакова высьвятляць на старонках газэты «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА».

Абаронім інтарэсы рабочай моладзі.

— У сельска-гаспадарчых майстэрнях імя Ал. Бурбіса з-за непрыняцьця мер прадасьцярожнасьці адміністрацыяй, ледзь не загінуў вучань Сурко.—У тэатральных прадпрыемствах брань палкам не запоўнена, майстры не навучаюць вучняў спэцыяльнасьці — У фабзавучы друкароў—вучні шляюцца па майстэрням ня маючы вучэбных работ.

Э-эх—недахопаў шмат.

(Сел.-гасп. майстэрні імя Бурбіса, Менск.)

Хлапцы—скардзяцца

Бадай кожны ведае, што калі рабочы на прадпрыемстве робіць посьпехі—дык узнагародай за гэта бывае павышэньне ў разрадзе.

Так было і з вучнямі-падросткамі. Іншыя з іх даўно перашлі з 1-га разраду ў шосты. Інакш кажучы зрабіліся майстрамі,

Але вось, што далей шостага разраду нашы хлапцы ніяк пераскочыць ня могуць.

— У чым справа? Хлапец працуе на прадпрыемстве 6 год і мае толькі 6-ты разрад. Чорнарабочы паступае ў кузьню і таксама праз тры-два месяцы мае такі-ж разрад, як і той хлапец, што працуе ўжо 6 год.

А загадка проста разьвязваецца: моладзь даходзіць да гэтай катэгорыі кваліфікацыі і далей... Стоп!

Моладзі даюць шаблённую працу: як штампаваць дзіркі, прарэзваць балты і іншае. Не знаёмяць з больш цікавымі галінамі працы.

З пад машыны...

Ня так даўно ў сталярным цэху здарыўся такі выпадак:

Малады вучань-сталяр зашоў у машыннае аддзяленьне, каб абгабляваць некалькі брускоў. Зьвінелі пасы, шківы. Дынама шалёна круціла трансмісіі.

Вучань Сурко і ня заўважыў, як пас захапіў канец яго вопраткі і пацягнуў ў шківы.

Адзін момант і машына закруціла Сурко ў сваіх шківах.

Невядома што было б далей, каб у гэты момант не застанавілі машыны.

Сурко выцягнулі з пад машыны зусім голага. Замест вопраткі, па ім засталіся толькі боты на ногах і каўнерык ад кашулі. З боку сарвала скуру і былі зламаны тры пальцы.

Камісія абсьледаваўшая гэты выпадак дзівіцца, як мог выжыць асюль жывым гэты хлапец.

Сурко выздаравеў і папрасіў адміністрацыю, каб яму выдалі новую вопратку. Яму у гэты адмовілі і адказаўшы:

— Ты чаму палаў ня ў свой цэх. Свае брускі ты мог абгабляваць і ў мадзельнай...

Але невядома чаму адміністрацыя ня кажа аб тым, што ў машынным аддзяленьні ня ўсе пасы адзеты ў прадахраніцелі...

В.

Брань не запаўняецца

(Саюз працаўнікоў мастацтва).

Усяго налічваецца на брані па БССР—40 падросткаў і 8 перапросткаў. Цалкам брань запоўнена толькі ў 1-м Белар. Дзярж. Тэатры (10 проц.), зусім слаба ў яўрэйскім (1 проц.) і ў Бедзяржкіно (4 проц.).

Навучэньне падросткаў адбываецца на „беспраграмных" асновах, па віне ЦК саюзу Рабіс СССР. Майстры ні ў якай меры не ўзнагароджаныя за навучаньне падросткаў, адносяцца да гэтае справы „спусьціўшы рукавы" (паказённаму).

Ня дзіва, калі пры такой кваліфікацыі з вучняў мастакоў выйдуць яўныя невучы, сьвядомасьць якіх здольна выклікаць толькі ўсьмешку на вуснах...

Досыць сказаць, што за мінулы час мы выпусьцілі ледзь-ледзь—1 памочніка кіно-мэханіка і 1 памочніка рабочага па сцэне.

Нельга не падкрэсьліць, што па 1-му БДТ (у Менску) асыгнаваньні на вучнёўства ў 1926-27 г. гэтулькі мізэрныя-што ні аб якіх „скоках" у разрадах гаварыць ня прыходзіцца.

Справа застыла на адным мейсцы. Неабходна якія-небудзь рашучыя меры дзеля ажыўленьня працы падросткаў у саюзе працаўнікоў мастацтва.

Мікола К—і.

За вучобную працу.

(Менск ФЗВ друкароў).

Здаецца фабзавуч, чаго лепш, усе работы павінен выпаўняць па заложанай яму праграме, але ў нас далёка да гэтага. Праграмных работ няма. І усё вытворчае навучаньне прыходзіцца праводзіць на заказных работах, якія у большасьці сваёй не падыходзяць да праграмы.

Далей аб вучобных работах. У нас цяпер бываюць частыя прастоі. У пераплётным аддзяленьні кожны дзень большая частка вучняў шатаецца бяз дзела.

— Таварыш інструктар, дайце мне вучобную работу, я вось хачу навучыцца складаць рамку,— просіць вучань інструктара.

— Загадчык не дазваляе. А сам я не магу.

Такі адказы, вучняў бязумоўна не здавальняюць.

Такое становішча ўтварае і недысцыплінаванасьць сярод вучняў.

Калі у машынным аддзяленьні гэтага нельга зрабіць з-за некаторых выдаткаў як: ток, зношываньне матар'ялаў і машын, дык у пераплётным аддзяленьні даваць вучэбныя работы магчыма.

Мікола.

Перашкаджаюць вучобе.

(Віцебск, профшкола мэталістых).

Больш паловы вучняў нашай школы—яўрэі. І большасьць з іх нахочуць вывучаць родную яўрэйскую мову. У часе лекцыі палуднуюць, сядзяць у шапках, кідаюцца агрызкамі, і гэтым зразумела перашкаджаюць настаўніку, не даючы яму магчымасьці выкладаць з-за рогату і шуму.

Тое-ж самае і з вывучэньнем беларускае мовы. Перад лекцыяй беларускае мовы некаторыя вучні ставяць „на дыбы" скамейкі, топчуць нагамі крэйду. Некаторыя вучні ўжо атрымалі за гэткія праступкі—выгаворы з папярэджаньнем аб звальненьні.

Як вынік з гэтых фактаў—Райкому ЛКСМБ трэба правесьці сярод комсамольцаў і вучняў нашай школы шэраг дакладаў і гутарак аб нацыянальнай політыцы нашай партыі.

М. Рудны.

Зьявішча не нармальнае

(М. Бяльнічы Магілеўшчына).

У нас у мястэчку ёсьць раённая бібліятэка з працаю ў якой адзін бібліятэкар справіцца ня можа.

Дзеля гэтага ён трымае ці як брань ці як памочніка сына вядома местачковага гандляра.

Вельмі дзіўна, што на гэта райпрофбюро ня зьверне ўвагі.

Няўжо ў мястэчку няма беспрацоўных хлапцоў, якія маглі-б працаваць у бібліятэцы? ВАРКА.

Не засталося на паперы.

(Савецкая гаспадарка „Рагінь")

Мы пастанавілі: трэба вывучыць беларускую мову ўсім комсамольцам. І вывучаем яе ў школе перасоўцы, дзе вучыцца большая палова нашых комсамольцаў, а таксама і ў беларускім гуртку пры хаце-чытальні.

Выкікі справаздачнай кампаніі.

(Віцебшчына).

Справаздачная кампанія кіруючых органаў КСМ і Акругкому ў прыватнасьці, значна ўскалыхнула ўсю акруговую організацыю. Мы маем шэраг выпадкаў калі сходы ячэек па справаздачы бюро зацягваліся і перанасіліся на другі дзень. Ня меншая актыўнасьць праяўлена і па справаздачы акруговага камітэту. Для характэрыстыкі прыводзім

некольні лічб.

Усяго справаздач было зроблена —26, а іх у горадзе—14 і ў вёсцы—12. Справаздачы рабіліся на куставых сходах ячэек у горадзе і пашыраных пленумах Райкомаў у вёсцы.

Па прыблізных падліках справаздачамі Акругкому ахоплена 8 200 комсамольцаў — што складае 39,8 проц. усёй акруговай організацыі. Фактычна—лічбы большыя.

На расейскай мове справаздач рабіліся 14, на беларускай—11 і яўрэйскай—1.

Выступала ў спрэчках—240 чалавек і задана пытаньняў—940 (прыблізна) характар пытаньняў і іх зьмест вучэсьць цяжка, трэба адзначыць, што 90 проц. з іх задавалася па практычным пытаньням саюзнай працы.—

Пару слоў

аб чым гаварылі ў спрэчках.

Цэнтрам спрэчак у горадзе зьявіліся пытаньні эканомічнай працы саюзу. Адзначалася і з гэтым трэба поўнасьцю згадзіцца, што ў справе кваліфікацыі моладзі, павышэньні заработнай платы і зьнішчэньні беспрацоўя, зроблена мала.

Гэтаму многа прычын незалежачых ад Акругкому, але што зьяўляецца балючым аб тым больш і гаворыцца. Беспрацоўе і выпадкі ўстройства на працу праз протэкцыянізм выклікае нездавальненьне ня толькі комсамольцаў, але і беспартыйнай моладзі—гэтае пытаньне заняло значнае месца ў спрэчках.

Шмат казалі і аб пытаньнях агітпроп работы, і аб тым, што кожны год з падручнікамі атрымоўваецца заміна, у выніках чаго політвучоба пачынаецца несвячасова.

У спрэчках выявілася, што пытаньні росту не зьяўляюцца яшчэ зразумелымі для ўсёй масы нізавога актыву, а тым болей для шэрагавых комсамольцаў. У некаторых месцах меліся прапановы аб неабходнасьці спыніць рост комсамолу па той прычыне што мы маем шмат хваробных зьявішч і іх зьнішчэньне магчыма будзе толькі тады калі мы апраўдаем прынятых у комсамол.

Супольна з гэтым выявілася шмат цікавых момантаў і ў справе разуменьня комсамольцамі сутнасьці нац. політыкі. Па тых запісках якія давяліся па дакладах і спрэчак можна судзіць аб тым, што ў справе растлумачэньня пытаньняў нац. політыкі трэба яшчэ надзвычайна многа зрабіць.

Спрэчкі па справаздачах спрыялі выяўленьню шэрагу нахварэўшых пытаньняў у становішчы і працы акруговай організацыі — гэта дасьць магчымасьць акругкому накіраваць сваю ўвагу на шмат пытаньняў якія патрабуюць найхутчэйшага вырашэньня ў бягучай працы.

Выкікі.

Трэба адзначыць, што справаздачная кампанія поўнасьцю апраўдала сябе і дала магчымасьць выявіць шэраг дасягненьняў і недахопаў у працы акруговай організацыі.

Спрэчкі паказалі значную дзеяздольнасьць і рост ячэйковага актыву і выступалі ня толькі актывістыя але і шэраговыя комсамольцы ячэек. Значная частка правяноў ужо цяпер скарыстана ў працы акруговага камітэту. Сорака-процантнае абхапленьне справаздачамі акругкому,—усёй організацыі сьведчыць аб поўным апраўдваньні кампаніі і найбольшай пашуле рызацыі працы АК перад акруговай організацыяй.

Асноўным недахопам кампаніі можна лічыць тое, што ў спрэчках надзвычайна мала гаварылася па пытаньню ўдзелу КСМ у гаспадарчым будаўніцтве і выкананьне пастаноў 7-га зьезду УсеЛКСМ—такое становішча гаворыць за тое, што па гэтым галінам працы ў далейшым надзвычайна яшчэ многае патрэбна зрабіць.

Акрамя гэтага наглядаецца слабое наведваньне комсамольцам сходаў ячэек у горадзе (занятасьць на працы ў вячэрніх зьменах вытворчасьці) і пашыраных пленумах Райкомаў у вёсцы (выпадкі дрэннай пагоды).

Справаздачная кампанія ўнесла большую яснасьць у далейшую працу АК і канчаткова апраўдае сябе толькі тады калі практычныя прапановы будуць выкананы у далейшай рабоце акругкому.

Міхась Лабадаеў.

Прасталі цэлы год.

(Бялкоўскі с. с., Петрыкаўскі раён).

Рэвізійная камісія мацага сельсавету, у склад якой уваходзяць 2 комсамольцы-актывісты зусім не працавала. Трэба было зрабіць тры разы рэвізію, а яна аб гэтым і не падумала.

Як высоўвалі на працу ў камісію комсамольцаў, дык сяляне спадзяваліся, што ёю будуць адзначаць усе памылкі працы сельсавету. Надзеі ня споўніліся. Сяляне незадаволены комсамольцамі, што уваходзяць у рэвізійную камісію.

С. Залескі.

Комсамолка—старшыня сельсавету.

Найлепшая праца ў раёне.

(Савіцкі сельсавет, Азярыцкі раён, Мазырская акруга).

У справаздачы Азярыцкага РВК адзначана, што з усіх сельсаветаў раёну лепшая ўсё праца пастаўлена ў Савіцкім сельсавеце, дзе старшынёю зьяўляецца сялянская дзяўчына комсамолка ПАКУШ Палагея

На гледзячы на цяжкія ўмовы працы, якія заключаюцца ў неаднолькавым складзе насельніцтва па свайму соцыяльнаму становішчу—праца наладжана вельмі добра, канфліктаў сельсавету з сялянствам ня прыкмячалася.

Па здачы сельска-гаспадарчага падатку, Савіцкі сельсавет стаіць увесь час на першым месцы.

Сяўбародзя дзядзькі, якія выступалі ў спрэчках па справаздачы РВК, радасна зазначылі:

— „Вось табе і дзяўчына! Паболш бы нам такіх!".

Спадзяемся, што арыверыбр.х гэта пажадальнае дзядзькоў будзе выкананае.

З. Я. ГУБАР.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

(У ЦК ЛКСМБ).

Да пленуму ЦК ЛКСМБ.

Пленум ЦК ЛКСМБ скліканецца 11-га студзеня г. г. з абвесткай дню якая ужо друкавалася ў „Чырвонай Зьмене".

Вучэт рабочай моладзі.

Згодна пастановы ЦК ЛКСМБ у працягу студзеня месяцу г. г. будзе праведзен вучэт рабочай моладзі па ўсім фабзаўмясцовам з мэтай вымуленьня яе становішча.

У Наркамаховы здароўя.

На пасяджэньні бюро ЦК ад 29 сьнежня быў заслуханы даклад прадстаўніка ў Наркамаховы Здароўя тав. Брадоцкага. У прынятай рэзолюцыі дадзен шэраг указаньняў адносна аховы здароўя працоўнай моладзі.

Эканомнарада.

Бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіла ўсебеларускую эканомнараду перанесьці на 20-га студзеня 1927 году.

Да абсьледаваньня барысаўскай організацыі.

Бюро ЦК ЛКСМБ заслухала даклад сакратара Барысаўскага АК ЛКСМБ тав. Зіноўева і падакład камісіі на абсьледаваньню барысаўскай організацыі аб становішчы апошняй.

Вынікі абсьледаваньня будуць канчаткова зацьверджаны на наступным бюро ЦК ЛКСМБ.

Дадатковыя месцы на пленум ЦК ЛКСМБ.

На пленум ЦК ЛКСМБ даецца 5 дадатковых мест Гомельскаму і тры —Рэчыцкаму АК, апрача ўжо прадстаўленых.

Акруговы конкурс германістых.

Бюро Аршанскага акруговому ЛКСМБ пастанавіла правесьці акруговы конкурс на лепшага германіста 10 лютага 1927 году.

Дзеля організацыйнай падрыхтоўкі да конкурсу выдучана спэцыяльная камісія, у склад якой увашлі прадстаўнікі АК ЛКСМБ, АК АСПС рэд. „Чырвонай Зьмены" і інш.

Гэтай-жа камісіі даручана абгаварыць пытаньне і прадставіць бюро практычныя прапановы аб правядзеньні конкурсаў у раёнах.

У ЦБ краязнаўства

○ Выйшаў з друку апошні (11-12) нумар часопісі «Наш край», які ставіць і вышчае пытаньні аб чарговых задачах школьнага краязнаўства.

○ Ў кастрычніку-сьнежні мінулага году ЦБ краязнаўства правяло на ўсіх акрагах краязнаўчыя канфэрэнцыі. На ўсіх канфэрэнцыях абгаворваліся пытаньні аб удасканаленьні моладзі ў краязнаўчую справу, у выніку з пастановай ЦК ЛКСМБ. На Аршанскай канфэрэнцыі выявілася што па акрузе прымаюць удзел у краязнаўчай справе 50 піонэраў і 58 комсамольцаў.

○ 16 лютага скліканецца Усебеларускі краязнаўчы зьезд, на якім будзе прысутні каць 144 дэлегаты ад месц і 50 ад Менску.

○ З мэтай вывучэньня цікавых мясцоў Беларусі, пры ЦБ складзена падарожніцкая камісія у склад якой увашлі прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і ВСФКВ.

За невыкананьне рашэньня ЦК.

Бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіла паставіць на від Віцебскаму, Менскаму, Барысаўскаму, Полацкаму, Калінінскаму, Мазырскаму Аршанскаму і Магілеўскаму АК ЛКСМБ за нявыкананьне пастановы ЦК аб рэгулярным штомесячным узносе на карысьць морфлёту.

МОПР'аўскія грыўні...

За сьнежань мінулага году ЦК МОПР'у БССР атрымаў вольных паступленьняў ад усіх акругаў на карысьць палітычных вязьняў за рубяжом—4.800 руб. Гэтыя сродкі цалком адасланы Выканаўчаму Камітэту МОПР (Масква).

Усіх паступленьняў ад дапучаных Гомельскім прадбачваецца да 1.700 руб. у месяц.

„Беларускі піонэр"

— З студзеня с. г. часопісь «Беларускі Піонэр» выходзіць два разы у месяц пры вымоцаваным фармаце і на 32 старонках.

— Пэшыраная рэдкалегія «Бел. піонэра» складзена з наступных таварышоў: Яліновіча, Пакарчыка (ЦВ ЮП), Брыгневіча (Наркамасвэты), Жураўскі (Галоўсавмас) і Мамчыца (пастаўшчык).

— У сучасны момант атрэды гор. месту праводзяць кампанію за павялічэньне падпіскі на «Беларускі піонэр». На сходах атрэдаў праводзяцца гутаркі аб часопісі, організуюцца спэцыяльныя вечары і г. д.

Сярод маладнякоў-цаў

○ Здадзен у друк № 1 часопісі «Маладнік» на студзень 1927 году.

○ Выйшаў з друку нумар Віцебскай філіі, «Маладняка», пад назвай «Пачатак»

○ Адбыўся Вабрыйскі акруговы сход філіі Маладняка, які падагуліў дасягненьні філіі за 1926 год.

Новыя выданьні

ЦВ „Маладняка" выпусціў з друку наступныя кнігі: Джэк Лёндан—„Нязвычайны адрынак" (пераклад з ангельскага А. Мардвілкі) і Міхась Чарот—Лепіш (поэма).

Таксама у бліжэйшы час выйдзе з друку новая кніжка У Галубка «Шляхам Мадонна».

Кіно-хроніка

Беларкінкіно закупіла усю вытворчасьць кіно фабрыкі «Межрабпом Рус» і ВУФКУ, у ліку якой знаходзяць такія фільмы, як «Процесс о 3-х миллионах», «Мэгс Мэнд», «Крылья холопа» і інш. Таксама закуплена яшчэ 60 замежных фільм бакінскоу.

Усе гэтыя фільмы будуць дэманстравацца у часовых кіно-тэатрах пачынаючы з студзеня г. г.

У бліжэйшым будучым Беларкінкіно прыступае да засьвоіньні кіно-іскусьці сваёй вытворчасьці пад назвай «Наша Беларусь»

На лыжы!

У дзень адчыненьня Менскай лыжнай станцыі функцыянавала 68 пары лыжаў. Прынесці ўдзел у гэтым спорце 50 чал. Заняткі адбываліся вельмі ажыўлена.

Плата за пракат для сяброў профсаюзаў устаноўлена ў 20 кап. у гадзіну, для гурткоў ФЗК і саюзных выязнак на лыжах--15 кап., для заняткаў гурткавых па ФЗК--10 к.

Суд.

„Ці мая--ці нічыя"...

На было горшага хулігана у весцы Рагаўка, Вабрыйскай акругі, як Міхась Матвейчык. Усе сялане баяліся яго. На усе вечоркі і вагуляньні ён зьяўляўся непаданым госьцем і хуліганіў.

Дзеці яго ўхіляцца ён ка Марыляй Горбель і абяцаў на ёй жаніцца. Але Марыля, добра ведаючы хулігана, ня верыла і выходзіла яго слову і всякак ад яго старалася. Іншыя хлапцы сьмяяліся над Міколай, што усе дзеці ад яго старонніцца і пазат Марыля гладзець на яго ня хоча. Такім насьмешкі вельмі зачапілі прыгожага хлапца. Ня раз клаву ён, хвалячыся перад сваімі таварышамі:

Ці мае—гі вінна будзе Марыля!

Некалькі разоў удавалася яму сустрэцца з Марылаю. Але кожны раз яна ад яго уцякала.

Аднойчы пазаўчыраму Міколе расправіцца з гонаровым дзюжаю.

Доўго ўно лежаў у яго схаваны у сьвіраны ад вінтоўкі. Дзе адзіначыўся хуліган выпіў бутэльку самагону, моцна запісаў у дрыжачыя рукох абрэз і схаваўся каля Марылінай хаты.

Чакаць прышлося ня доўга. Нічога не падазраючыя весела ішла даюу Марыля.

— Стой, ці з мосты!

Гучны выстрал разарваў сонную весну. Забрахалі сабакі, зьявіліся людзі. Каля хаты сабраўся натоўп людзей. Ня абступаю трэп Марылі.

Вабрыйскі акруговы суд прыгаварыў Міколу Матвейчыка да 10 год вымаўлення в сэрэвым адзіжаваньнем.

Рыгор.

Эксплоатацыя рабочых подросткаў.

Справа аб зьвяшчаньні Полацкіх рабочых подросткаў Эстрыка і Самаілевіча разглядалась 27 верасьня г. г. у трудовой секці Нарсуда. На лаўцы падсудных зьявілася пол дзя хлапцоў: адвакат-стажыста Брахаро «Праўды».

Нарсуд фэтэкспэртацыі вучыў устанавіў (на выплаце за вымучасовую працу (ад скарыстаньні водпуск.

Віцебскі акрсуд, куды з боку арэсці была пададзена апэляцыйная скарга, прыгавор Полацкага суду засьвердзіў. Здавалася бы, што гісторыя гэта ідзе к канцу. Але ня тут то было! Гэтыя асобы падаюць скаргу вышэй, у Менск і тым самым адцягваюць справу.

Высьвятляючы гэтую справу на старонках «Чырвонай Зьмены», мы спадзяемся, што адпаведныя органы правядзіць разьбіраньне і пакажуць вінаватых па заслугам.

Юнкор „Ч. Зьмены".

Розныя весткі

○ Яўрэйскі рабфак (1-ы ў БССР) пачынецца пры ЬДУ васьля зімовых канікул.

○ 11 новых школ сялянскае моладзі пачынена па Віцебшчыне у поным навучальным годзе.

○ 10-ы нумар «Маладняка» выйшаў у сьвет 28-га студзеня.

У тры радкі

▣ Да 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі Гіпэрт ЦК КПБ выдае літэратурны зборнік, у які увойдзе шмат твораў маладняковцаў.

▣ Буйную партыю літэратуры для хат-чытальняў (на 5000 руб) выслаў гэтымі днямі у акруг Гаворыцкасьветы.

▣ Навуковая праца „Сьлед першабытнага чалавека ў БССР" у хутка часе будзе выдана Інбелкультам пад рэдакцыяй арэолога Сорэ'ва. Гэта праца грунтуецца на данных Віцебскага і Магілеўскага музэяў.

▣ На палепшаньне становішча 49 школа рабочай моладзі БССР адпучана урадам на 1926 27 г.—23.000 р.

▣ Радыё выставка адчыняецца гэтымі днямі у Менску. Экспанаты ня выявяць рост радыё-прамысловасьці БССР.

▣ Дадатковы час па фізкультуры ў сямёгодках (5-7 клясах) уведзен амаль па усіх акругах.

▣ Беспрацоўе па БССР за апошні справаздачны месяц вымавілася у 18.815 чал. (прырост за год на 9,9 проц.)

Ці наведаў ты Дзяржаўны Музэй?

Калі не, дык раім гэта зрабіць

За тры гады свайго існаваньня Беларускі Дзяржаўны Музэй адвіў 1.100 экскурсіяў.

Зь гэты час наведала Музэй — звыш 35 000 чал. (вучнёства—50 проц., вайсковых —20 проц., рабочых—10 проц., студэнтаў—10 проц.). Меншасьць тут складае сялянства, якое дапушчаецца у Музэй ва ўсе дні.

Па багацьцю экспонатаў (асабліва этнографічных) музэй займае адно з першых месцаў, пасьля музэяў Масквы і Ленінграду.

Асаблівую увагу звяртаюць на сябе адделы: палеонтаграфі і (шмат возратаў, вымяшкі, рэчаў быту і дамаводзтва: (старыжна-археалягічны (рэчы каменнага веку, курганчага перыяду і г. д.); нумізматычны (да 11000 монэт X. XI і XII стагодзьдзяў—нумізмат, англійска-саксонскіх і г. д.).

Музэй адчынен кожную нядзелю з 12 да 3-х гадз. дня усім, а дня экскурсій—на чацьвергох і суботах (па запісах).

М. В—аў.

100 місак на 250...

Дрэннае харчаваньне, адсутнасьць бялізны, хваробы.

Што выявіў досьлед Дзіцячага Гарадку?

Наркамаховы Здароўя хадайнічаў стаўніцтва і быт выхаванцаў у Менскім Дзіцячым Горадку імя Чарнякова.

Вынікі досьледу выкрылі шмат адмоўных бакоў.

У дванцаці малых пакоях бялізны, купаюць іх 1 раз у тры тыдні.

З дванцаці з 250 выхаванцаў толькі 46 маюць вершыню возратку.

Парша, чэсотка і розныя запаленьні хваробы звычайнае зьявішча. 60 проц. дзяцей свойдзіцца малакроўнымі! Туберкулезных налічваецца 45 проц.

Харчаваньне у Гарадку дрэннае: крупы і увечары сухі гарбата, масла і сала дадзена 1—2 разы у тыдзень.

Агульны вахас місак—100 штук гэта на 250 ч.

Котлеты сак-так цалых не больш 100. рэшта—адна рвань...

Вынікі досьледу уносяцца на разгляд Саўнаркому.

ЗАПЫТАНЬНІ І АДКАЗЫ

ЗАПЫТАНЬНЕ № 732 (Завалкаво А.) Ці можа ячэйка КПБ прымаць у кандыдаты КПБ комсамолца, якому 16 год?

АДКАЗ. Ня мае права. У партыю прымаюць толькі з 18 год.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 733 (С. К.) Ці мае права комсамолец расказываць беспартыйным тое, што пастанавіла бюро, ці камуніст агульны сход ячэйкі? Якія меры трэба прымаць да гэтага комсамолца?

АДКАЗ. Комсамолец, бясумоўна, ня мае права расказваць беспартыйным аб тым, што гаварылася на закрытым сходзе. Адгаданай меры за гэта няма. Тут трэба падыходзіць к кожнаму комсамольцу паасобна.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 734 (Г. Абр.) Ці мае права ячэйка або райком выключыць з комсамолу хлапца без яго ведама, ка і ён не ўдасьць сяброўскіх увосаў за 3, ці 4 м-цы?

АДКАЗ Кожны сябр ЛКСМ павінен ведаць, што, згодна статуту ЛКСМ, не плацілыка сяброўскіх увосаў на працягу трох месяцаў, механічна выбываюць з шэрагаў комсамолу. Але перад выключэньнем бюро ячэйкі павінна ведаць гэтага хлапца на пасяджэньне і дакладчыка аб прычынах выключэньня із сяброўскіх увосаў.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 735 (Ф) З колькіх гадоў можна пасылаць у бронь кандыдата?

АДКАЗ. Бронь запускаецца падлеткам ад 16 да 18 год.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 736 (Рутчанка) Ці можна пераведзьці в бронь у прыкладчыкі хлапца, калі яму ашчэ няма 18 гадоў і ён пасьля будзе прыкладчыкам 8 гадзін.

АДКАЗ. Прыкладчыка дзіцяці ад падлетку ад 16 да 18 год ня можа працаваць 6 гадзін.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 737 (Хвалка) Чаму гэта комсамольцам-сябрам саюзу саугандзі служачых на дапомаг пасылаюцца бесправоцу?

АДКАЗ. Пенсіі на бесправоцу выдаючыцца ўсім слабым профсаюзу у залежнасьці ад стажу ка-ву і вытворчага стажу.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 738 (Пісіхава) Калі сялянкі паступіці у гэтым годзе на першы курс комсамольскага тэхнікуму і трымаюць сувязь з вёскай, колькі яму патрэбна даручэньняў каб паступіць у партыю?

АДКАЗ. Калі ён твоесь час прыкладу на гаспадарцы і займаецца і шы год дык прымаецца у партыю па 2-ой катэгорыі, а на тэму яму патрэбны тры рэкамендацыі сяброў партыі з 2 х гадовым пастажам.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 739 (Заловскага) Які адрас нарабочай секцыі Наркамасвэты?

АДКАЗ Менск, Пляц Волі, Наркамасвэты, Яўрэйская секцыя.

На кніжной паліцы.

„Памяти Л. Б. Красина". Зборнік успамінаў. „ГІЗ". 1926 г. 25 стар. Ц. 15 кап.

«Л. Б. Красін, — гаворыць рэдакцыя у прадмове да кнігі,—тым асабліва выдзяцца у шэрагу вялікіх дзеячоў нашай рэвалюцыі, што у ім часьцей на яны ім лежыць, тэхніка, цы старой бальшавіцкай гвардыі, выключна адданасьць рабочай мясе і яго партыі з добрымі вядомі і найнадзейнымі вопытам капіталістычнай грамадзкі.

Шаноўны тав. КРАСІН карыстаўся вялікаю павагаю ведаўшых яго і яго сьвяцкі выклікала шэраг водгукаў. Важнейшыя з іх сабраны у гэтай кнізе. Тут артыкулы—успаміны Л. Начарскага, Кржыжаноўскага, Енукідзе, Лядава, М хі Цэхнова Ольденбурга і інш. Яны абмалёўваюць Л. Б. Красіна з усіх бакоў яго многагранной асобы. Вельмі характэрна у гэтых адносінах апісаньне яго апошніх дзён:

«Жудасна гладзець, як чалавек расстае на вачох. Але самае жудаснае, што яно прыходзілася перажыць у сувязі з хваробаю т. Красіна, гета чытаньне паведамленьняў аб яго здароўі. Гета—матэрыял для абыхолета. Красін сам робіць сабе аналіз крові. Сам лічыць ліх крывяных цукэк, нагружаюча задачы увіс, лічыць, працу кажны, месяцы і тыдні затрымліваюцца жыцьця і бліжэйшае паводзіны аб сваім здароўі, яна пачынаюцца аналізы: у пакоях такая та тэмпэратура, агульны становішча такое-то, ліх цукэк толькі то, а увіс под із «Л. Красіна». Вы кожу пэрачытваеце паведамленьні, вы задзіраеш сілаю гетага мастацкага чалавека: ён вішы аб сабе, упіваючы, як аб трэцяй асобе, як доктар аб пацыенце, у стыле тонкіх гратэскай сарказмы. Хворы бесьпадзейнай хваробай, ён дажыпшіх дзіся застаўся такім-жа энэргічным і правадзіцельным, як і ў ва усіх сваіх пройдзеных жыцьці.

Н. Вайнгаўз. У дапамогу дзетгоргурткам і рэдколегіям насьценга эг.

Пад такой назвай выдавецтва «Чырвоная Зьмена» выпусціла невялічкую кніжку на беларускай мове.

Аттаруе кнігай і арыгінальнай формай расказвае і растлумачвае пастуцным пытаньні «хто такі дзетгоргурт», «як навучыцца пісаць», «які выгляд павінна мець насьценная газета», «як прыцягнуць дзетгоргурт» і г. д.

Вробіцца, як відаць, імкнуцца пытаньні, і пагатаку яна не пазбаўлена некаторых недахопаў. Напрыклад аб такіх пытаньнях, як аб выбарах, аб ліку, аб'ектах, аб'ектах, аб'ектах